ЗМЕСТ

## КАЗКІ ЖЫЦЦЯ

Жывая вада ........................... 7
У балоце ........................... 11
Адзінокае дрэва ........................... 16
Зло — не заўсёды зло ........................... 21
На чужым грунце ........................... 23
Камень ........................... 27
Хмарка ........................... 29
Кажух старога Анісіма ........................... 34
Балотны агонь ........................... 36
Чыя праўда? ........................... 39
Крыніца ........................... 42
Асінае гняздо ........................... 49
Супраць вады ........................... 52
Стары лес ........................... 55
Даль ........................... 61
Чортаў камень ........................... 64
Што лепей? ........................... 66
Гусі ........................... 69
Што яны страцілі ........................... 73
Купальскія светлякі ........................... 83
У чым іх сіла ........................... 87
Вадаспад ........................... 94
Ноч, калі папараць цвіце ........................... 98
Кучаравае дрэва ........................... 103
Залаты прамень ........................... 107
На ўсё ёсць прычына ........................... 114
Хвароба ........................... 124

Над прасторамі зямлі .................. 128
Як птушкі дуб ратавалі ................ 134
Цвіркун ........................... 140
Адзінокі курган ..................... 147
Страказа ............................ 150

## СЫМОН-МУЗЫКА

Частка першая ....................... 159
Частка другая ....................... 199
Частка трэцяя ....................... 252
Частка чацвёртая .................... 303
Частка пятая ........................ 354

# КАЗКІ ЖЫЦЦЯ

*«Не ў адной толькі нашай душы*
*Зерне ёсць хараства —*
*Аб ім казку складае ў цішы*
*Колас нівы, трава.*
*Не ў адным толькі сэрцы людзей*
*Іскра праўды гарыць —*
*Аб ёй песню пяе салавей,*
*Аб ёй рэчка журчыць.*
*У той песні, шырокай, як свет,*
*Чутны ветры і гром.*
*Дык прымі ж ты прывет,*
*Свет бязмежны, мой дом.»*

*(«Замест прадмовы». 1907–1921 гг.)*

# ЖЫВАЯ ВАДА

## I

Даўно-даўно, не за нашу памяць было гэта.

Шчаслівы то быў вугалок Божага свету.

Вольна жылося людзям у тым вугалку. Ніхто іх не гнаў, ніхто не крыўдзіў, нікому яны не належалі. Багатая, урадлівая была іх зямля. Шырока раскінуліся іх палі, зялёныя травы сенажацей калыхаліся на ветры. Ціха і весела смяяліся кветкі, нахіляючы свае пахучыя галоўкі і пазіраючы ў раку, якая паіла ўвесь той кут і тых, хто жыў і рос там, і давала яму жыццё. Усё жыло каля ракі, гэту раку людзі называлі Жывою Вадою. Усё жывое і нежывое любіла яе, і песні волі разліваліся па ўсіх кутках шчаслівай старонкі.

Але не доўга застаецца шчасце на адным месцы. Пакінула яно і той вугалок Божага свету.

Нешта страшнае і незразумелае для чалавека зрабілася там. Нейкая цёмная сіла пазайздросціла шчасцю людзей.

У тым месцы, адкуль выцякала Жывая Вада, зямля стала ўспучвацца. Борзда, як грыб, вырастала гара. А Жывая Вада пачала павольна мялець і хутка зусім згінула дзесьці ў зямлі. Толькі след, дзе цякла яна, надоўга застаўся на зямлі і гаварыў людзям пра даўнейшае жыццё.

Гара ўсё расла. Праходзіў час, пусцела зямля, з гары сыпаўся жоўты пясок і засцілаў ураджайны грунт. Людзі збяднелі, птушкі разляцеліся. Не чутно ўжо было там вясёлых

песень. Толькі арлы ды каршуны вілі свае гнёзды на высокай гары, што ўсмактала ў сябе Жывую Ваду.

## II

Бяднеў год ад году каліся-то багаты край. Ураджайны грунт засыпаўся пяском. Многа працавалі людзі, многа пралівалі поту, а праца іх прападала, і скупа плаціла зямля за работу і пакуту. Развяліся чэрві на агародах — некаму было зніштажаць іх, бо каршуны і ястрабы разагналі птушак.

Расказваў бацька сыну пра даўнейшае жыццё — пра багацце іх краю, пра гару, якая глынула іх Жывую Ваду, сама стала расці, а жыццё ўсяго краю прысудзіла да маруднай смерці. Глухая злосць на праклятую гару падымалася ў сэрцы людзей, бо памяць аб Жывой Вадзе не прападала.

Не мала знаходзілася смелых людзей, якія ішлі на гару шукаць Жывой Вады.

Бралі яны рыдлёўкі, раскопвалі гару. Але з гары сыпаліся на іх каменні, разбівалі ім галовы. Каршуны і ястрабы зляталіся хмарамі, выдзёўбвалі ім вочы. А пугач і сава ўночы спявалі ім «вечны спакой» сваім жудасным крыкам.

Многа, многа людскіх касцей валялася вакол гары, а каршуны і крумкачы разносілі іх па ўсіх кутках спустошанага краю. І людзі празвалі сваю старонку Мёртвым Полем.

Дзіка і пуста стала ў Мёртвым Полі. Людзі хадзілі, як цені, галодныя, прыгнечаныя. Птушкі даўно перасталі там спяваць песні. Толькі каршуны кружыліся ў небе, каркалі крумкачы і наганялі нуду на душу людзей, невядомымі страхамі палохалі сэрца, розум.

Нават лес змяніўся: старыя дрэвы даўно згнілі і ляжалі ў зямлі, а новыя былі нізкія, крывыя, няўдалыя — як сухотныя. Рэдка заглядалі туды хмары, і мала калі праходзіў дождж.

## III

Насталі сухія гады. Апошні выдаўся такі год, што ні разу не было дажджу за ўсё лета. Кожны дзень неба аставалася чыстым, ясным, гарачым. Усходзіла сонца, борзда сушыла расу, што блішчала ранкам, як слёзы, на лісцях раслін. А сухі вецер гуляў над зямлёю, падымаў гарачы пясок, высмоктваў апошнія сокі з зямлі. Лес, поле, луг з гаротнаю мальбою пазіралі на неба, прасілі вады прагнаць смагу. Дрэвы глуха шумелі, шум зліваўся ў адну доўгую, невядомую людзям песню. Жаласна ківаліся каласы ў полі, то кланяліся зямлі, то падымаліся да неба, нібы просячы ратунку.

Ніхто не ішоў ім на дапамогу, і яны без пары старэлі, жоўклі і без жыцця хісталіся на сухіх сцяблінках. Трава і кветкі ціхутка шапталі ветру аб сваёй нядолі. Цярплівыя камяні і тыя нылі ад спёкі і лопаліся. Сама зямля зморшчылася, як бабулька, пакалолася і

плакала. Яе слёзы апошнімі кропелькамі расы выступалі наверх, яе просьба белаватым туманам звісала над лесам і разносілася вятрамі па свеце. Пакутавалі людзі, плакала зямля і ўсё, што расло і жыло на ёй. Непрыкметна падымаліся да неба іх слёзы, падымаліся яны не год і не два, а цэлыя вякі, а там недзе сплываліся ў адно месца. Тыя слёзы, горкія скаргі, усё гора зямлі — змяшаліся разам і завіслі над ёю страшнаю чорнаю хмараю.

## IV

А дзе ж дзелася Жывая Вада?

Яна была пад гарою, яна паціханьку размывала гару, прабівала сабе дарогу на Божы свет. Ніхто гэтага не ведаў. Не ведала і гара, што вісела над бяздонніцаю. А Жывая Вада чакала толькі шчаслівага здарэння, каб скінуць з сябе цяжар — праклятую гару, што з шчаслівага кутка зрабіла Мёртвае Поле.

І настаў такі час, што пралітыя слёзы перапоўнілі неба і паліліся назад на зямлю. Не ў сілах было само неба стрымаць тыя слёзы. Самі яны рваліся туды, дзе нарадзіліся патроху, падымаліся ўгору.

Людская жальба, гора, пакута, усё няшчасце зямлі, што збіраліся тысячамі гадоў, паліліся цяпер са слязьмі адной хваляй.

Адвечная скарга грымела ў небе страшным голасам грому і скалынала ўсю зямлю; стогны людскія, якіх дагэтуль ніхто не чуў, блішчалі маланкамі, а слёзы цяклі халоднымі, чыстымі

ручаямі на зямлю і ажыўлялі яе. Вада збіралася ў адну раку і дружна стала напіраць на гару.

Зрушылася гара; моц яе — каменні градам сыпаліся наніз. Арлы, каршуны, крумкачы, ястрабы, совы пазляталі з гары, каб запыніць ваду.

Пачула і Жывая Вада, што робіцца над ёю. Сабрала яна ўсе сілы свае і ўскалыхнула гару, як купіну. Яе падхапіла дажджавая вада. Страшны шум пайшоў па Мёртвым Полі.

Усё жывое дрыжала ад страху і чакала пагібелі. Але згінула адна гара. Пяском і пылам развеялася яна па полі.

Гневалася неба, бушавала вада, трэслася зямля. Ліліся рэчкі па кожнай разоры і зліваліся з Жывой Вадою.

Прайшоў страшны момант, і стала спакойна. Вада ўся злілася ў старое рэчышча Жывой Вады, і жыццё, што стрымлівалася праз доўгі час гарою, зноў пайшло сваёю дарогаю, і ажыло Мёртвае Поле.

## У БАЛОЦЕ

### I

Загразла ў балоце панская брычка разам з панскаю сям'ёю, слугамі, коньмі, з усім панскім скарбам. Урэзалася яна ў гразь па самыя калодкі, засела на сярэдзіне балота. Палеглі на чэравах коні і... ні тпрррy!.. ні но!

Ніхто не чакаў такога здарэння. Сядзяць паны, як мурашкі, на купіне сярод лужыны. Бяда прылучылася, нібы з грому. Але не век жа сядзець злажыўшы рукі, трэба ж даваць якую раду. Першы апамятаўся пан і ўзяўся за работу. Перш-наперш трэснуў ён кулаком фурману ў спіну, вылаяўся на ўсё балота і пусціў у ход усю машыну. Фурман, узяўшы пугу, высвенцаў коней. Коні задрыгалі нагамі, заварушыліся з аднаго боку на другі, і... машына стала.

Ясна, што трэба злазіць з воза. Злез фурман, слугі, пан, пані, паненкі. Месяцца па гразі, як мухі па смятане, тупаюць вакол брычкі, бядуюць, охкаюць, ахкаюць. Адзін радзіць тое, другі — другое; крычаць, таўкуцца — толькі рэха ходзіць па балоце.

Больш за ўсіх працаваў фурман: ён махаў рукамі, аддаваў каманду, аж сам пан пачуў нейкі страх і скакаў пад фурманову дудку.

— Пхайце ўзад! — крыкнуў фурман ва ўсё горла і сам учапіўся за аглоблю.

Пан упёрся плячом збоку; лёкай, пані і паненкі ўзад пхалі.

— Рразам! — крыкнуў фурман.

Ніхто не разлічыў свае сілы: пані так моцна налягла, што ў гразь уляцела па калені; фурман сарваўся з аглоблі і ляпнуўся чэравам у балота, аж капялюш з галавы скінуўся. А пан як павярнуў плячом, дык брычку сарваў са шворна і палажыў яе на бок. Цяпер малюнак змяніўся: пані, цярэбячыся з гразі, згубіла чаравік, фурман поўзаў ракам па балоце, а пан стаяў,